У. М. Свяжынскі





СЛОВА СКАРЫНЫ

MIGIISSV



Stay







ВОДА

wasser



EMIE


woning

HNEIK

deuoti



AFFECTUS







ШШ
ЪЫЬ
ЭЮЯ

a lotto


ДЕ















У. М. Свяжынскі

СЛОВА СКАРЫНЫ



Мінск
«Народная асвета»
1984

ББК 81. 2 Бел
С 25

Рэдакцыйная калегія серыі:
А. Я. Міхневіч, доктар філалагічных навук
А. А. Падлужны, доктар філалагічных навук
А. А. Крывіцкі, кандыдат філалагічных навук

Рэцэнзент С. А. Падокшын, кандыдат гістарычных навук

Для старэйшага школьнага ўзросту

Свяжынскі У. М.

С 25 Слова Скарыны: [Для ст. шк. узросту/[Афармл. Э. Э. Жакевіча, В. П. Масцерава].— Мн.: Нар. асвета, 1984.— 48 с., іл.— (Скарбы мовы).

15 к.

У брашуры расказваецца аб вытоках і народным характары мовы выданняў беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны, аб яго спадчыне.

Для старэйшага школьнага ўзросту.

С $\frac{4802000000-10}{М\ 303(05)-84}$ 87—84 **ББК 81. 2 Бел**

© Выдавецтва «Народная асвета», 1984.

УВОДЗІНЫ

Ест бо в сихъ притчах сокрита мудрость, якобы моць в драгом камени, и яко злато в земли, и ядро у в ореху.

Ф. Скарына



аяўленне першай друкаванай кнігі ўсходніх славян — рускіх, украінцаў і беларусаў — звязана з іменем нашага славутага земляка з Полацка Францыска Скарыны. 6 жніўня 1517 г. у сталіцы Чэхіі Празе выйшла з «францешкова друку» першая беларуская кніга на стараславянскай мове «Псалтыр», якая прызначалася «людемъ посполитымъ къ доброму научению». Першая руская друкаваная кніга — «Апостал» Івана Фёдарава — выйшла ў 1564 г. На працягу двух гадоў (1517—1519) Скарына выдаў яшчэ 22 біблейскія кнігі. Вярнуўшыся ў сталіцу Вялікага княства Літоўскага Вільню, Скарына надрукаваў дзве кнігі — «Апостал» і «Малая падарожная кніжыца». Каб кнігі былі больш зразумелымі для простага чытача, выдавец даў тлумачэнні на палях, прадмовы і пасляслоўі. Гэта быў першы крок пашырэння выкарыстання беларускай мовы.



Геніяльнае скарынінскае пачынанне было затым прадоўжана яго выдатнымі паслядоўнікамі Сымонам Будным, Васілём Цяпінскім, братамі Лаўрэнціем і Стэфанам Зізанія-

мі, Мялеціем Сматрыцкім і іншымі ўсходнеславянскімі асветнікамі.

Скарына паказаў усяму свету годнасць беларускага народа і яго культуры. Зараз яго кнігі як найвялікшая каштоўнасць захоўваюцца разам з кнігамі першадрукароў і асветнікаў іншых краін у бібліятэках і музеях свету.

Адным з важнейшых дасягненняў Скарыны з'яўляецца спроба гуманістычнага тлумачэння Бібліі. У прадмовах да сваіх кніг, прыцягваючы прыклады са свяшчэннага пісання, ён імкнуўся абгрунтаваць і апраўдаць гуманістычныя ідэі Адраджэння. Зроблены ім пераклад Бібліі на мову, блізкую да народнай, зрабіў яе даступнай больш шырокаму колу чытачоў.

Мэтай сваёй дзейнасці Скарына лічыў далучэнне простага народа з дапамогай Бібліі да асветы. Побач з гэтым ён імкнуўся зрабіць Біблію сродкам маральнага і эстэтычнага выхавання людзей. Хоць для беларускага першадрукара і было характэрна ў нейкай ступені захапленне Бібліяй, але ён бачыў у ёй не толькі рэлігійны, а і маральна-выхаваўчы, інтэлектуальны, павучальны твор.

Скарына — вялікі патрыёт, верны і адданы сын свайго народа. Нягледзячы на тое што ён вучыўся, працаваў у Заходняй Еўропе, ён не парваў сувязей з радзімай, а ўсе сілы і веды, усю сваю энергію аддаў служэнню «людем посполитым». Дзейнасць, падобную скарынінскай, К. Маркс разглядаў як сведчанне абуджэння нацыянальнасцей у эпоху Адраджэння і Рэфармацыі. Біблія Скарыны адыграла важную ролю ў развіцці беларускай мовы і беларускай культуры ў цэлым.

Пра Францыска Скарыну, яго жыццё, асветніцкую дзейнасць, ролю ў развіцці беларускай мовы і кнігадрукавання напісана нямала кніг. Аўтар у гэтай невялічкай кніжцы хацеў бы яшчэ раз нагадаць старшакласнікам пра знакамітага палачаніна, пра яго выданні і, галоўнае, даць уяўленне аб мове, якой карыстаўся беларускі першадрукар, робячы свае кнігі «людем простым».

ИЗЪ СЛАВНАГО ГРАДА ПОЛОЦЬКА...



анец XV — пачатак XVI ст. азнаменаваны тым, што адносны застой у грамадскім жыцці, які быў характэрны для эпохі сярэдневякоўя, адыходзіў у нябыт. На змену ішла новая эпоха, якая азнаменавалася бурным уздымам у гаспадарчым, палітычным і культурным жыцці народаў Еўропы. «Гэта быў буйнейшы прагрэсіўны пераварот, перажыты да таго чалавецтвам, эпоха, якая патрабавала тытанаў і якая парадзіла тытанаў па сіле думкі, страсці і характару, па шматграннасці і вучонасці»,— пісаў пра эпоху Адраджэння Ф. Энгельс [1].



Перадавыя мысліцелі і вучоныя таго часу смела кідалі выклік рэлігійным цемрашалам. Яны адмаўлялі асноўныя сцвярджэнні свяшчэннага пісання аб стварэнні свету богам, аб яго развіцці ў адпаведнасці з боскай воляй. Імкненне аспрэчваць святыя догмы было небяспечна: за гэта заплацілі жыццём многія выдатныя дзеячы Адраджэння — Джардана Бруна, Мігуэль Сервет, Томас Мюнцэр і інш.

Асноўным зместам новай эпохі быў рух Рэфармацыі — рух за аб-

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч., т. 20.—346 с.

наўленне царквы. Рух гэты зарадзіўся ў асяроддзі прыгнечаных сялян і гараджан. Ён быў накіраваны супраць засілля каталіцкай царквы ў палітыцы, эканоміцы і культуры заходнееўрапейскіх краін. Адначасова гэта быў рух маладой буржуазіі супраць феадалізму. Рэфармацыйны рух прывёў да ўзнікнення новай разнавіднасці хрысціянства — пратэстантызму ў выглядзе лютэранства, кальвінізму і іншых сект. Рэфарматары-пратэстанты лічылі, што чалавек павінен непасрэдна зносіцца з богам, без удзелу царквы, духавенства, абразоў. У ліку мер супраць каталіцызму яны прапанавалі пераклад Бібліі на нацыянальныя мовы. Так узніклі пераклады свяшчэннага пісання на нямецкую (Марцін Лютэр), французскую (Жан Кальвін), англійскую (Джон Уікліф) і іншыя мовы. Са славянскіх краін першыя пераклады Бібліі ўзніклі ў Чэхіі ў XIII—XIV стст. Першая чэшская Біблія выйшла ў 1488 г. у Празе, другая — у 1506 г. у Венецыі. Гэта апошняя і паслужыла Скарыне крыніцай для перакладу на царкоўнаславянскую мову.

Змены, якія адбываліся ў Заходняй Еўропе, закраналі і Беларусь. Тэрмін «Белая Русь» упершыню сустракаецца ў канцы XIV ст. у адносінах толькі да Полацкай зямлі. У далейшым ён пашырыўся на ўсю Беларусь. Доўгі час назвы «Белая Русь», «беларусы» ўжываліся побач з назвамі «Русь», «рускія». У пісьмовых дакументах таго часу Беларусь часта называецца яшчэ Літвой, а беларусы — літоўцамі або літвінамі ў знак таго, што яны былі жыхарамі Вялікага княства Літоўскага, у якое, акрамя Літвы і Беларусі, уваходзіла і Украіна. З таго часу «Літвін» стала на Беларусі распаўсюджаным прозвішчам.

У выніку сумеснай барацьбы славянскіх і літоўскага народаў у бітве пад Грунвальдам быў разгромлены захопніцкі Тэўтонскі ордэн нямецкіх рыцараў-крыжаносцаў. Літоўскія князі выкарыстaлі аслабленасць заходніх рускіх княстваў у барацьбе з мангола-татарамі і падпарадкавалі іх сабе. Так і ўтварылася Вялікае княства Літоўскае. Ва ўмовах адасобленага ад астатніх рускіх зямель існавання

ўзніклі беларуская і ўкраінская народнасці са сваімі культурамі і мовамі.

Полацк, родны горад Скарыны, быў адным з буйнейшых беларускіх гарадоў таго часу. Пры Скарыне ў ім налічвалася 40—50 тысяч насельніцтва — па тым часе даволі многа. З XI ст. горад упрыгожваў храм Святой Сафіі, які і сёння глядзіцца ў павольныя воды Заходняй Дзвіны. У XII ст. была ўзведзена Спаса-Ефрасіннеўская царква, заснаваная дачкой полацкага князя Ефрасінняй.

Калі ў жніўні 1579 г. войскі польскага караля Стэфана Баторыя пасля месячнай асады Полацка ўварваліся ў горад, то замест прадметаў раскошы, золата і серабра, на якія яны разлічвалі, знайшлі ў Сафійскім саборы вялікую бібліятэку. Сярод кніг былі пскоўскія і полацкія летапісы, асобныя кнігі належалі пяру славянскіх першаасветнікаў Кірыла і Мяфодзія.

Полацк быў буйнейшым гандлёвым цэнтрам Вялікага княства Літоўскага. Гэтаму садзейнічала яго прыроднае становішча: размешчаны на беразе паўнаводнай Дзвіны, ён быў месцам скрыжавання гандлёвых шляхоў — у Прусію, Паўночную Русь, Прыбалтыку.

У Полацку былі развіты разнастайныя рамёствы. У 1510 г. тут налічвалася больш за 17 розных прафесій рамеснікаў. Вырабы полацкіх рамеснікаў разам з мясцовай сыравінай вывозіліся на продаж у іншыя гарады і за межы Вялікага княства Літоўскага, у гарады Расіі (Ноўгарад, Пскоў, Смаленск, Цвер, Маскву), Украіны (Кіеў, Львоў, Перамышль), Польшчы (Варшаву, Кракаў, Торунь, Гданьск, Познань, Люблін), а таксама ў Турцыю, Венгрыю, Румынію, Малдавію, а праз Рыгу — і ў Заходнюю Еўропу.

У такім вось горадзе з вялікімі сацыяльнымі кантрастамі і высокаразвітой культурай і нарадзіўся выдатны дзеяч беларускай культуры — Францыск Скарына. Дакладны год нараджэння Скарыны невядомы. Паколькі ў Кракаўскі універсітэт ён быў запісаны ў 1504 г., а прымаліся туды юнакі

не маладзей 14 год, то ён мог нарадзіцца прыблізна ў 1485 г.

У літаратуры, прысвечанай Скарыне, яго называюць то Францыск, то Георгій. Гэты разнабой пачаўся тады, калі была знойдзена копія напісанай па-лацінску прывілейнай граматы, дадзенай Скарыне каралём Сігізмундам 25 лістапада 1532 г. у Кракаве. У пачатку гэтай копіі і толькі адзін раз перад іменем Скарыны Francisci стаіць і Georgii (давальны склон). Далей у тэксце гэтай копіі Скарына называецца адным іменем — Францыск (Franciscus). Толькі так называе ён сябе і ў прадмовах да сваіх выданняў. Так узнікла думка, што Скарына, як было тады прынята, меў два імені: адно свецкае — Францыск, другое царкоўнае — Георгій. Аднак пры супастаўленні гэтай копіі са знойдзеным пазней арыгіналам аказалася, што ў апошнім перад іменем Францыск стаіць іншае слова — egregium — «выдатнаму». Значыць, Georgii ў копіі з'явілася па недагляду перапісчыка. Так было ўстаноўлена, што адзіным іменем Скарыны з'яўляецца Францыск.

Скарына — выхадзец са знатнага купецкага роду. Як сведчаць полацкія акты 1535 г., бацька Францыска Лукаш меў у Полацку зямельную маёмасць. Пасля яго смерці каля 1492 г. зямля гэта перайшла ў спадчыну да сыноў — Івана і Францыска. Іван гандляваў з купцамі Вільні, Рыгі, Львова, Познані, Варшавы. У Познані ў яго была вялікая гандлёвая база і склады шкур. Яму ў Познань Францыск пастаўляў у вялікай колькасці лёнскае сукно. У Гданьску жыў другі брат Францыска, Раман. Натуральна, што матэрыяльны дабрабыт і частыя кантакты з культурнымі цэнтрамі Еўропы ў значнай ступені абумовілі імкненне Францыска Скарыны да вышэйшай універсітэцкай навукі.

В ЛЕКАРСТВЕ И В НАУКАХ ВЫЗВОЛЁНЫХ ДОКТОР...





карына атрымаў пачатковую школьную адукацыю — навучыўся чытаць па псалтыру, пісаць кірылічнымі літарамі ў Полацку, у бацькоўскім доме. У манахаў-бернардзінцаў добра авалодаў лацінскай мовай. Юнака вабілі далёкія краіны, пра якія так цікава расказваў бацька-купец. Францыск выбраў Польшчу, горад Кракаў, славуты ў тыя часы. Сюды ехалі вучыцца з Венгрыі, Славакіі, Маравіі і іншых еўрапейскіх краін. Хаця большасць школяроў з Літоўскага княства ў Кракаве была з багатых сем'яў, сярод іх былі і бедныя, якія зараблялі сабе на жыццё выпадковымі ўрокамі і прыслужваннем прафесарам. У Кракаве вучыліся Мікалай Капернік, аўтар славутай «Хронікі Літоўскай» Мацей Стрыйкоўскі, паслядоўнікі Скарыны пісьменнікі і друкары Мацей Кавячынскі, Лаўрэнцій Крышкоўскі, Сымон Будны.

10 кастрычніка 1506 г. Скарына, праслухаўшы курс лекцый у Кракаўскім універсітэце, быў удастоены вучонай ступені бакалаўра «навук вызволёных». «Вызволёнымі» ў той час лічыліся сем навук, якія падзя-

2 Зак. 3751

ляліся на два разрады — трывіум (граматыка, рыторыка, дыялектыка) і квадрывіум (арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка). Пад рыторыкай разумелася ўменне прыгожа і складна гаварыць, пад дыялектыкай — уменне весці спрэчкі. Пасля гэтага Скарына яшчэ павышаў сваю адукацыю (дзе — невядома) і атрымаў ступень доктара «вызволёных» навук.

Тыповым для дзеячаў навукі і культуры эпохі Адраджэння было блуканне па універсітэтах. З дыпломам доктара навук «вызволёных» Скарына ў 1512 г. едзе ў Падую. Ён паступае ў Падуанскі універсітэт, будучы сакратаром дацкага караля. Магчыма, калі летам 1509 г. польскі кароль накіроўваў дэлегацыю ў Данію для заключэння дагавора аб дружбе, Скарына быў у складзе гэтай дэлегацыі, застаўся ў Даніі і некаторы час служыў у караля сакратаром. Дакументы сведчаць, што Скарына, прыехаўшы ў Падую, быў абмежаваны ў сродках (бацька яго к гэтаму часу памёр) і прасіў даць яму магчымасць без платы, даволі значнай, трымаць экзамен на ступень доктара медыцыны.

5 лістапада 1512 г. у падуанскай царкве святога Урбана сабраліся вучоныя мужы медыцынскай калегіі універсітэта, перад якімі выступіў віцэ-прыёр Тадэо Мусаці, які, паведамляючы на традыцыйнай лацінскай мове аб прычыне гэтага ўрачыстага пасяджэння свяціл тагачаснай італьянскай навукі, сказаў: «Шаноўныя панове дактары! Прычыны склікання Вашых Светласцей наступныя: ёсць адзін вучонейшы юнак, доктар навук, бядняк, з вельмі далёкіх краін, быць можа, за тысячы з чымсьці міль ад гэтага славутага горада, дзеля павелічэння славы і чэсці яго, а таксама гэтай слаўнай гімназіі і святой калегіі нашай прыбыў сюды і жадаў бы ад гэтай святой калегіі атрымаць ступень доктара медыцыны бяскоштна, па спецыяльнай міласці і з ласкі божай».

Экзамены былі вытрыманы бліскуча, і «вучоны муж» Барталамей Барызон урачыста ўсклаў на Скарыну традыцыйныя атрыбуты доктарскай годнасці.

ВЫЛОЖЕНЫ ДОКТОРОМ ФРАНЦИСКОМ СКОРИНОЮ С ПОЛОЦЬКА...



ля першадрукароў узорамі паслужылі рукапісныя кнігі, таму друкаваныя кнігі сваімі шрыфтамі, мастацкім афармленнем настолькі былі падобныя на рукапісныя, што іх цяжка адрозніць.

Вынаходства друкарскага станка дало магчымасць вырабляць танныя кнігі вялікімі тыражамі.

Гэта вынаходства зрабіла вялікі пераварот у асвеце тагачаснага грамадства.

Першым друкаром у Еўропе быў нямецкі майстар Ёхан Гутэнберг. У 1440 г. ён вынайшаў спосаб друкавання перасоўнымі літарамі, набіраючы з іх радкі і адціскаючы іх на паперы. Вядома, першы друкарскі станок быў даволі простым, нават прымітыўным. К канцу XV ст. у Германіі было ўжо 50 друкарань і больш чым 200 друкароў. Былі друкарні ў іншых гарадах і краінах Еўропы — Італіі, Венецыі, Мілане, Парыжы, Сіцыліі, Галандыі, Венгрыі, Іспаніі, Фларэнцыі, Лондане, Лейпцыгу, Даніі, Партугаліі, Вене. Ужо ў канцы XV ст. кнігадрукаванне знайшло практычнае прымяненне ў 246 еўрапейскіх гарадах. За сорак год, да канца стагоддзя, было выда-

дзена каля 40 000 кніг агульным тыражом прыблізна 12 мільёнаў экземпляраў.

Кнігадрукаванне распаўсюдзілася на славянскія краіны — спачатку Чэхію, потым Польшчу. У Кракаве немец па паходжанню Феоль Швайпольт адкрыў сваю друкарню, дзе ў 1491 г. надрукаваў на царкоўнаславянскай мове некалькі царкоўных кніг. Але пачынанне Феоля, як і многіх іншых першадрукароў, пацярпела няўдачу: яго абвінавацілі ў ерасі, і друкарню прыйшлося закрыць. Цікава, што мова кніг Феоля мае паасобныя беларускія і ўкраінскія рысы. Відаць, памочнікамі Феоля былі выхадцы з гэтых зямель.

Праз пяць год пасля заканчэння Падуанскага універсітэта, у 1517 г., дасягнуўшы вяршынь тагачаснай навукі, Скарына арганізоўвае ў сталіцы Чэхіі Празе сваю ўласную друкарню. Прыязджае ён у Прагу, відаць, значна раней, бо патрэбен быў час, каб перакласці Біблію з чэшскай мовы на царкоўнаславянскую і падрыхтаваць яе да друку. Сама ідэя выдаць Біблію на мове, блізкай да народнай, была ўспрынята Скарынай ад дзеячаў Рэфармацыі — лютэран і гусітаў, якія вялі барацьбу супраць улады Ватыкана ў заходнееўрапейскіх краінах і гвалтоўнага насаджэння незразумелай народу лацінскай мовы ў богаслужэнні. Прага як месца друкавання кніг была абрана Скарынай, відаць, таму, што тут можна было параўнальна лёгка дастаць паперу і шрыфты побач, у нямецкім горадзе Нюрнбергу, дзе кнігадрукаванне ўжо набірала сілу.

У адным з раёнаў Прагі, які называўся Старое месца, на працягу 1517—1519 гг. з-пад дошак друкарскага станка Скарыны выходзяць 23 біблейскія кнігі. Фінансавую дапамогу Скарыне ў ажыццяўленні яго геніяльнай задумы аказваў віленскі купец Багдан Онькаў, або Анькович. Пасля выхаду кніг ён скупіў увесь тыраж, каб затым прадаць з выгадай для сябе. На вокладцы адной з кніг захаваўся надпіс Онькава: «То ся стало накладом Богдана Онькова сына радци места Виленского».

Скарына спыняе сваю выдавецкую дзейнасць у Празе і ўзнаўляе яе толькі ў 1525 г. у Вільні. Дырэктар Вроцлаўскай бібліятэкі прафесар Маркграф (канец XIX ст.) у кнізе пратаколаў пракуратуры г. Вроцлава (Польшча) выявіў вялікую колькасць лістоў з васьмі розных пражскіх выданняў Скарыны. Калі Скарына друкаваў свае кнігі ў Празе, у Германіі пачаўся ўзняты Марцінам Лютэрам бунт супраць Ватыкана. У сувязі з гэтым папа рымскі Ляон X выдаў булу, якой заклікаў знішчаць ерэтычныя лютэранскія кнігі. Відаць, былі прызнаны ерэтычнымі і канфіскаваны кнігі, якія вёз з сабой Скарына, вяртаючыся праз Польшчу ў Вільню. Гэтыя кнігі, магчыма, былі перададзены затым у пракуратуру. Можа, былі канфіскаваны і шрыфты, бо ў Вільні Скарына друкуе ўжо іншымі шрыфтамі.

У Вільні Скарына адкрывае сваю новую друкарню ў доме Якуба Бабіча, «найстаршого бурмистра славного і великого мѣста виленского». У 1525 г. ён выдае яшчэ дзве кнігі — «Апостал» і «Малую падарожную кніжыцу». У «Малую падарожную кніжыцу», акрамя «Псалтыра», уключаны астранамічны каляндар, у якім адзначаны вясенняе і асенняе раўнадзенствы, летняе і зімняе сонцастаянні, вылічаны даты зацьменняў Сонца і Месяца. Гэта сведчыць аб вялікіх прыродазнаўчых інтарэсах Скарыны. Кнігі надрукаваны кішэнным фарматам, каб іх зручна было насіць з сабой. Яны прызначаліся купцам і рамеснікам, якія па роду сваіх прафесійных заняткаў вымушаны шмат падарожнічаць.

Падзеі пазнейшага часу не давалі Скарыне магчымасці займацца кнігавыдавецкай дзейнасцю.

Відаць, з тым каб здабыць грошы, Скарына вязе частку сваіх кніг у Маскву. Аднак там яго спасцігла няўдача: рэакцыйнае праваслаўнае духавенства прызнала яго кнігі ерэтычнымі, і па загаду цара Івана Васільевіча яны былі канфіскаваны і публічна спалены. Гэта — адна з прычын таго, што скарынінскіх выданняў захавалася да нашага

часу зусім мала. Цяпер іх у СССР 340 экземпляраў, за мяжой — 48.

У 1529 г. памёр у Познані брат Скарыны Іван, які пакінуў вялікія даўгі. Дарэчы, даўгавыя распіскі яго былі напісаны на беларускай мове таго часу. Даўгі былі аплачаны маёмасцю, якая засталася пасля Івана Скарыны.

Вясной 1530 г. Скарына, відаць, у пошуках заработку едзе ў Прусію, у горад Кёнігсберг, дзе наймаецца прыдворным лекарам да прускага герцага Альбрэхта. Там ён дорыць пратэстанцкаму епіскапу Прусіі Сперату «Псалтыр» з «Малой падарожнай кніжыцы». Цяпер гэта кніга захоўваецца ў музеі ў Лондане. У тым жа годзе Скарына, захапіўшы лекара і друкара, вяртаецца ў Вільню, відаць, з намерам аднавіць кнігадрукаванне. Герцаг Альбрэхт шле віленскаму ваяводзе Гаштольду ноту пратэсту з патрабаваннем вярнуць лекара і друкара.

Паколькі даўгі брата Івана былі вернуты крэдыторам не поўнасцю, яны дабіліся, каб Францыска пасадзілі ў турму. У турме Скарына праседзеў 10 тыдняў і быў вызвалены адтуль пляменнікам Раманам, сынам Івана. Акрамя таго, Скарына атрымлівае ад польскага караля дзве прывілеі — па адной ён вызваляўся ад выплаты даўгоў, па другой — ад усіх судоў, акрамя каралеўскага.

Нанесеныя крэдыторамі крыўды прымусілі Скарыну пакінуць Вільню. Ён едзе зноў у Прагу і паступае на службу да караля Фердынанда ў якасці садоўніка. Рознабаковая адукаванасць Скарыны не раз прыходзіла яму на дапамогу ў цяжкія часы.

Памёр ён не раней 10 чэрвеня 1540 г. Месцазнаходжанне яго магілы засталося невядомым.

Сын Скарыны Сімяон Рус дабіўся ў караля Фердынанда ліст, згодна з якім усе прадстаўнікі ўлады і грамадзяне Чэхіі павінны былі аказваць яму ўсялякае садзейнічанне ў адшуканні маёмасці і кніг бацькі. З гэтага ліста мы даведваемся аб апошніх днях жыцця і дзейнасці беларускага першадрукара і асветніка. У ім гаворыцца: «Доктар Фран-

цішак Рус Скарын з Полацка, садоўнік наш, які тут жыў, з'яўляецца іншаземцам у каралеўстве чэшскім, памёр і пасля сябе сына Сімяона Руса і нейкую маёмасць, лісты, пазыковыя абавязацельствы і іншыя юрыдычныя абавязацельствы пакінуў». У 1577 г. чэшскі летапісец запісаў, што сын Скарыны Сімяон Рус працаваў у гэты час лекарам у Крумлёве, на поўдні Чэхіі.

Да кожнай з выдадзеных кніг Скарына напісаў прадмову і пасляслоўе, у якіх выказвае мэту зробленага ім перакладу Бібліі, свае грамадскія і асветніцкія погляды.

У сваіх прадмовах Скарына звяртаецца «ко младенцем и людем простым», свае кнігі ён адрасуе «людем посполитым рускаго языка», «людем посполитым к доброму научению», яны прызначаны «для посполитого доброго» — для пашырэння сярод простага народа ведаў і добрых нораваў, каб дапамагчы людзям пазнаць мудрасць і навуку, «абы научившыся мудрости, добре жили на свете».

Біблія — гэта збор свяшчэнных паданняў хрысціянства і іудаізму. Яна дае няправільнае, фантастычнае ўяўленне аб свеце, усяляючы ў свядомасць простага народа рэакцыйную ідэю аб боскай прыродзе ўлады цароў і каралёў і падзелу людзей на бедных і багатых. Біблія стагоддзямі была магутнай зброяй прыгнёту ў руках libпануючых класаў. Чаму Скарына выдаў іменна Біблію, а не іншую кнігу? Погляд на Біблію як на найбольш аўтарытэтную крыніцу ведаў быў адметнай рысай той эпохі, яе традыцыяй.

Кіруючыся сваімі асветніцкімі мэтамі, Скарына імкнецца дапамагчы чытачу пранікнуць у змест Бібліі, для чаго ў прадмове да кожнай кнігі дае падрабязныя тлумачэнні. Тым самым Скарына вучыць чытача ўспрымаць Біблію свядома, а не на веру, што ніяк не адпавядала мэтам царквы. Сваёй дзейнасцю Скарына і іншыя асветнікі стварылі аснову для навуковай крытыкі Бібліі.

Скарына, як і іншыя асветнікі яго часу, бачыў у Бібліі важнейшую крыніцу ведаў, добрых нораваў, эстэтычнага задавальнення. Надаючы ёй такое практычнае значэнне,

асветнік тым самым пазбаўляў яе аўтарытэту свяшчэннай кнігі.

У змястоўнай прадмове «Во всю бивлию рускаго языка» Скарына ўказвае, крыніцай ведаў па якой галіне можа служыць для чытача тая або іншая кніга Бібліі: «Хощеши ли умети граматику или, по-руски говорячи, грамоту, еже добре чести и мовити учить, знайдеши в зуполной Бивлии, Псалтыру, чти ее. Пак ли ти ся любить разумети лоику (г. зн. логіку),— она же учить з доводом розознати правду от кривды,— чти книгу светого Іова или Послания светого апостола Павла. Аще ли же помыслиши умети риторику, еже есть красомовность, чти книги Саломоновы. А то суть три науки словесные. Восхощеши ли пак учитися музики, то ест певници, премножество стихов и песней светых по всей книзе сей знайдеши. Любо ли ти ест умети аритметику, еже вократце а неомылне считати учить, четвертыи книги Моисеевы часто чти. Пак ли же имаши пред очима науку геометрию, еже по-руски сказуется землемерение, чти книгу Ісуса Наувина. Естли астрономии или звездочети — найдеш на початку книги сее о сотворении солнеца и месеца и звезд... Аще ли же кохание имаши ведати о военных а о богатырских делех, чти книги Судей, или книги Маховеев, более и справедливе в них знайдеш, нежели во Александрии или во Тройи. Пак ли же вократце сведати хощеши много тысещей лет летописець, чти книги Паралипоменона. В первых же сих книжках, еже зовуть Притчи, пишеть о мудрости, науце, о добрых обычаех, о заповедех, яко ся мамы справовати и жити на свете».

Зразумела, з пункту погляду сённяшняга дня ў тым, што Скарына лічыў Біблію асноўнай крыніцай ведаў па ўсіх навуках («святое писмо все иные науки превышаеть»), крыніцай, больш багатай па зместу, чым гістарычныя аповесці «Александрыя» або «Троя», мы бачым яго наіўнасць і гістарычна абумоўленую абмежаванасць. Але гэта было заканамерным у тую эпоху, калі навука толькі-толькі пачала вызваляцца ад путаў багаслоўя.

На прыкладах са зместу Біблії Скарына выкладае свае прагрэсіўныя, гуманістычныя грамадскія і асветніцкія погляды. У асобе Скарыны, успрыняўшага ідэі Рэфармацыі, праваслаўнае веравызнанне спалучалася з верацярпімасцю, характэрнай для пратэстантаў.

Рэнесансна-гуманістычная і дэмакратычная афарбоўка характэрна для сацыяльна-палітычных поглядаў Скарыны. Ён лічыў, што імкненне да правапарадку з'яўляецца натуральнай патрэбнасцю кожнага чалавека. На яго думку, «праведному закон не ест положен», г. зн. добраму, выхаванаму і інтэлектуальна развітому чалавеку законы не патрэбны. Яны ствараюцца для людзей злых, небяспечных для грамадства. Галоўнае прызначэнне законаў — служыць грамадству на карысць. Закон грунтуецца на чалавекалюбстве і справядлівасці. Суд, на думку Скарыны, павінен быць справядлівым, суддзі павінны судзіць чэсна, беспрыстрасна. Ідэалам дзяржаўнага кіраўніка для Скарыны быў мудры, адукаваны, добры, чулы, справядлівы чалавек, здольны ў выпадку неабходнасці абараніць народ. Скарына лічыў, што феадалы павінны гуманна адносіцца да прыгонных, не караць іх за ўцёкі. Ён вучыў, што «богатии, обидяще убогих, приимут отмщение». Але бедным ён наказваў «все до часу терпети и на бога вскладати». У гэтым адбілася традыцыйнасць, гістарычная абмежаванасць поглядаў Скарыны.

У адрозненне ад многіх гуманістаў эпохі Адраджэння Скарына не лічыць просты народ цёмнай і неадукаванай масай, а звяртаецца да яго як да роўнага, верыць у яго інтэлектуальныя і маральныя магчымасці.

На ўзроўні перадавой грамадскай думкі таго часу знаходзіцца і этычнае вучэнне Скарыны. Ён сцвярджае, што каштоўнасць чалавечага жыцця, сэнс яго — у служэнні «пожитку посполитому», г. зн. на карысць грамадству, у самаўдасканаленні, «абы научившися мудрости люди добре жили на свете... Без мудрости и без добрых обычаев не ест мощно почтиве жити людем посполите на земли». Для

Скарыны вышэйшае дабро — дабро зямное, інтэлектуальна насычанае, маральна дасканалае і грамадска карыснае жыццё на зямлі, служэнне богу шляхам служэння людзям. Сапраўдная годнасць і высакароднасць чалавека заключаецца не ў паходжанні, не ў знатнасці, не ў сацыяльным становішчы, не ў рэлігійным запале, а ў інтэлекце, маральным абліччы. Чалавек сам, без дапамогі бога, здольны дасягнуць маральнага ідэалу. Менавіта таму Скарына акцэнтуе ўвагу на маральна-этычным баку зместу Біблії, ігнаруючы пры гэтым яе рэлігійна-дагматычны змест. Важнейшай годнасцю чалавека Скарына лічыў інтэлект. Ён праслаўляе людзей, якія імкнуцца да ведаў. У якасці прыкладу прыводзіцца цар Пталемей Філадэльф, уладальнік славутай Александрыйскай кніжніцы (г. зн. бібліятэкі), у якой налічвалася, як паведамляе Скарына, звыш 40 тысяч кніг. «Таковый убо былъ милосник наукы и мудрости,— піша пра яго Скарына,— иже болей избрал оставити в науце и в книгах вечную славу и память свою, нежели во тленных великих царскых сокровищах».

Скарына быў палымяным патрыётам сваёй радзімы. Свой патрыятызм, любоў да радзімы ён выказаў цудоўнымі словамі: «...понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя, птици, летающие по въздуху, ведають гнезда своя, рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя, пчелы и тым подобная боронять ульев своих, тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають».

Скарына разглядаў Біблію і як крыніцу эстэтычнага задавальнення. У гэтым першаступеннае значэнне ён надаваў «Псалтыру» — першай кнізе, надрукаванай ім у Празе 6 жніўня 1517 г. і перавыдадзенай ім затым у Вільні ў складзе «Малой падарожнай кніжыцы». «Псалтыр» уяўляе сабой, па сутнасці, зборнік паэтычных твораў, прызначаных для вакальнага выканання, ён выкарыстоўваўся таксама і для навучання грамаце. Таму Скарына піша пра «Псалтыр»: «...суть бо в ней псалмы, якобы сокровище всих дра-

гых скарбов, всякии немощи духовныи и телесныи уздоровляють, душу и смыслы освѣщають, гнев и ярость усмиряють, мир и покой чинять, смуток и печаль отганяют», падкрэсліваючы, што гэта кніга не столькі царкоўная, колькі здольная служыць крыніцай эстэтычнага задавальнення.

Вялікую эстэтычную каштоўнасць уяўляе сабой літаратурная спадчына Скарыны — яго прадмовы і пасляслоўі, якія характарызуюцца высокім узроўнем майстэрства. Скарына мае вялікія заслугі і перад беларускім вершаскладаннем. У Біблii ён змясціў тры свае вершы.

Сярод пражскіх выданняў сваім афармленнем вылучаецца кніга Біблii, якая называецца «Песня песняў». Яна адзіная з пражскіх кніг Скарыны надрукавана дзвюма фарбамі, чорнай і чырвонай. Самае вялікае пражскае выданне Скарыны — «Кнігі Царстваў» (484 с.). У ёй 12 гравюр, чатыры застаўкі, адна канцоўка і вялікая колькасць гравіраваных буквіц, змешчаны партрэт Скарыны. Пачатковая кніга Біблii ўпрыгожана гравіраваным тытульным лістом да ўсяго выдання, якое Скарына назваў «Бивлия руска». Гэта першы выпадак ужывання тытульнага ліста ў славянскай кнізе кірылаўскага шрыфту. З таго часу тытульны ліст трывала ўвайшоў у выдавецкую справу. Дзвюма фарбамі, чорнай і чырвонай, надрукаваны віленскі «Апостал». Ілюстрацый у гэтай кнізе няма, затое многа заставак, канцовак і гравіраваных буквіц. У наш час вядома толькі 10 экземпляраў гэтай кнігі. Зменшыўшы да мінімуму колькасць ілюстрацый у віленскіх выданнях, Скарына асноўную ўвагу ўдзяліў графічна-арнаментальнаму ўбранню кніг: тытульным лістам, застаўкам, канцоўкам, віньеткам, буквіцам [1].

Кнігі Скарыны надрукаваны выразнымі буйнымі літарамі з вялікімі прамежкамі паміж радкамі. У гэтых адносінах скарынінскія выданні пераўзыходзяць папярэднія

[1] Застаўка, канцоўка, віньетка — упрыгожанні, якія змяшчаюцца ў пачатку або канцы друкаванага тэксту, буквіца — вялікая літара ў пачатку тэксту, аздобленая ўзорам.

БІВЛИЯ РУСКА
выложена доктором
Франциском Скориною
из славнаго града По
лоцька, Богу ко чти и
людем посполитым
к доброму наученью.

Біблія Скарыны. Тытульны ліст.

Притчи :-

Предсловие в притчи премудраго Саломона царя Израилева :-

Пишеть стый Иоанъ во своемъ еу
ангелии • Иже нашъ спаситель
реклъ есть • Сия в притчахъ
глахъ вамъ, Приде же часъ яко
ктому не в притчахъ возглю к вамъ
но о Отци моемъ возвещу вамъ • Много
крат преже того в притчахъ глалъ е к намъ
гь богъ нежели принялъ человечество о пре
чистое Богородици Марии • Стыми отци
и пророки, а наболей Царемъ Саломономъ, онъ
бо просилъ есть о гда бога мудрости и разума:
И отвеща к нему гь богъ понеже жадалъ еси оу
мене словеси сего • а не просилъ еси собе
дней многыхъ, ни богатества, ниже душъ врагов
твоихъ • Но жадалъ еси собе мудрости к нау
чению судовъ, се учиних тобе по словеси твое
му • И далъ тобе срце мудро и смыслено

Біблія Скарыны. Старонка тэксту.

царкоўнаславянскія выданні і кнігі, выдадзеныя ў Венецыі. Прынята лічыць, што шрыфт быў вынайдзены самім Скарынай, ён вельмі блізкі да шрыфту старажытных рукапісных полацкіх грамат. Значыць, ён выразаны або самім Скарынай, або па яго рысунках. Шрыфт атрымаўся вельмі прыгожым дзякуючы каліграфічнаму і мастацкаму майстэрству Скарыны, а таксама ўмельству гравёраў, якія працавалі ў яго друкарні. Каб пазбегнуць аднастайнасці чытання, Скарына ўпрыгожвае старонкі, размяшчаючы тэкст у канцы раздзелаў і кніг трохвугольнікам, ромбам, у выглядзе чашы.

Для ўпрыгожвання тэксту ў пражскіх і віленскіх выданнях Скарыны шырока выкарыстоўваюцца застаўкі і ўпрыгожаныя вялікія літары (ініцыялы, або буквіцы). Выкананыя ў стылі готыкі і рэнесансу застаўкі змяшчаюцца звычайна пасля прадмовы перад пачаткам самога тэксту кожнай кнігі. Яны не звязаны са зместам кнігі і таму часта паўтараюцца. Гэта або чалавечыя фігуры, або лінейкі з кветкамі і лісцем. У цэнтры вялікай застаўкі з чалавечымі фігурамі заўсёды даецца выдавецкі знак Скарыны — спалучэнне сонца і месяца з чалавечымі тварамі. Майстэрствам вылучаецца апрацоўванне вялікіх пачатковых літар кожнага раздзела. Яны ўпрыгожаны звычайна малюнкамі пладоў, кветак, лісця, рыб, птушак, звяроў, людзей. У такой аздобе літар праявілася захапленне Скарыны прыродазнаўствам. Літары Скарыны пераўзыходзяць па прыгажосці літары многіх нямецкіх выданняў. Такіх літар у выданнях Скарыны тысячы. Кожная літара змешчана ў выразны прамавугольнік.

Пражскія выданні Скарыны вылучаюцца яшчэ сваімі гравюрамі. Усяго іх у яго выданнях 51, з іх у пражскіх 47, астатнія — у віленскіх. Яны зроблены смелымі штрыхамі, у чым адчуваецца рука вопытнага гравёра. У адрозненне ад заставак кожная гравюра звязана са зместам кнігі, яна з'яўляецца ілюстрацыяй да таго, аб чым у ёй напісана, і змяшчаецца ў самым пачатку кнігі, перад прадмовай. Змя-






Біблія Скарыны. Буквіцы.



Біблія Скарыны. Партрэт друкара.

шчаючы ў выданнях гравюры, Скарына меў на мэце зрабіць змест кнігі больш даступным для чытача, заахвоціць яго да ўнікнення ў сэнс напісанага, як ён сам аб гэтым піша: «...абы братия моя Русь люди посполитые чтучи могли лепей разумети». Гравюры суправаджаюцца тлумачальнымі надпісамі.

Гравюрамі Скарыны захапляліся яго сучаснікі і захапляюцца знаўцы мастацтва да нашага часу. Іх лічылі лепшымі, чым у іншых славянскіх кнігах, роўнымі толькі гравюрам славутых венецыянскіх выданняў прызнанага майстра, чараўніка кніжнай справы Альда Манучы. Гравюры Скарыны імкнуліся пераймаць нямецкія і чэшскія выдаўцы.

Асаблівай увагі заслугоўвае змешчаны Скарынай у Бібліі ўласны партрэт. Ужо само змяшчэнне партрэта выдаўца было выклікам царкве, бо ў Бібліі заслугоўвалі быць змешчанымі толькі партрэты святых. У гэтым адбілася ўласцівае Скарыне як дзеячу Рэнесанса пачуццё ўласнай годнасці.

Беларускі першадрукар паказаны ў сваім рабочым кабінеце. Ён сядзіць у крэсле за невысокім столікам, на якім ляжыць рукапіс. У правай руцэ — пяро. Ён працуе і толькі на секунду адарваўся ад рукапісу, каб абдумаць напісанае. Адзеты Скарына ў доктарскую мантыю па тагачаснай модзе. На яго галаве берэт, з-пад якога спадаюць на плечы пышныя валасы.

У рабочым кабінеце першадрукара расстаўлены разнастайныя рэчы: пясочны гадзіннік, падсвечнік са свечкай, гаршчок, кошыкі. Тут адчуваецца характэрная для ідэалогіі Рэфармацыі і Рэнесанса ўвага да быту канкрэтнага чалавека. У правым верхнім кутку — глобус Сусвету. Ніжэй на паліцах многа кніг у вялікіх пераплётах — уласная бібліятэка Скарыны. Перад намі не звычайны перапісчык, а відны дзеяч эпохі Адраджэння. Фігура самога Скарыны ў цэнтры гравюры — праяўленне ўласцівай мастакам Адраджэння ўвагі да асобы чалавека.

Не менш цікавыя і прыгожыя іншыя гравюры.

РУСКЫМИ СЛОВАМИ А СЛОВЕНСКЫМЪ ЯЗЫКОМЪ...



ершыя рукапісныя славянскія царкоўныя кнігі напісаны на мове, якую прынята называць старaславянскай. Гэта старажытнейшая агульная пісьмовая мова славян. Узнікла яна яшчэ ў IX ст. У той час мовы славянскіх народаў (рускіх, палякаў, чэхаў, сербаў, балгар) былі вельмі блізкімі паміж сабой і таму старaславянская мова была аднолькава зразумелай гэтым народам, паспяхова выконваючы сваю ролю агульнай пісьмовай мовы славян. Узнікненне старaславянскай мовы і пісьменнасці звязана з імёнамі выдатных грэчаскіх прапаведнікаў — Кірыла і Мяфодзія. Родам яны былі з горада Салуня, які знаходзіўся тады на славянскай тэрыторыі (цяпер гэта грэчаскі горад Салонікі). У 60-х гг. IX ст. мараўскі князь Расціслаў звярнуўся да візантыйскага імператара з просьбай прыслаць прапаведнікаў, якія б змаглі навучыць хрысціян — жыхароў Маравіі (цяпер гэта тэрыторыя Славакіі) богаслужэнню на роднай мове. Паколькі Кірыл і Мяфодзій жылі на славянскай тэрыторыі, то яны, акрамя сваёй роднай, грэчаскай мовы, доб-

ра ведалі і славянскую гаворку мясцовых жыхароў. Таму ім і была даручана справа стварэння пісьмовай мовы для славян.

Яшчэ да прыезду ў Маравію Кірыл на аснове грэчаскага алфавіта выпрацаваў славянскую азбуку, якая па яго імені стала называцца кірыліцай. У Маравіі Кірыл і Мяфодзій пераклалі з грэчаскай мовы на славянскую царкоўныя кнігі. (За гэта яны былі нават прылічаны да ліку святых.) Так узніклі першыя славянскія кнігі. У далейшым, калі славянскія мовы пачалі губляць сваё былое падабенства, старaславянская мова стала падвяргацца ўплыву асобных славянскіх моў. Так узнікла некалькі рэдакцый, або зводаў, царкоўнаславянскай (так яна пачала называцца з гэтага часу) мовы — сярэднебалгарская, руская, сербская, харвацкая, чэшская, румынская. Пазней у выніку ўплыву мовы беларускай народнасці на рускую рэдакцыю царкоўнаславянскай мовы ўзнікла беларуская рэдакцыя.

Адным са стваральнікаў беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы і з'яўляецца Францыск Скарына. Уплыў беларускай мовы на царкоўнаславянскую ў выданнях Скарыны адбываўся шляхам свядомага і несвядомага ўвядзення ім у царкоўнаславянскі тэкст беларускіх слоў і форм. Аб ступені гэтага ўплыву мы даведаемся, разглядаючы канкрэтныя асаблівасці мовы выданняў Скарыны.

Цікава, што і сам Скарына разумеў, што яго мова царкоўнаславянская, але ў ёй сустракаюцца рускія (г. зн. беларускія, усходнеславянскія) элементы. Ён часам схільны быў нават лічыць мову сваіх выданняў роднай, г. зн. беларускай. Вось як ён піша пра гэта ў прадмове да «Псалтыра»: «Я, Францишек, Скорининъ сынъ с Полоцька, въ лекарскихъ наукахъ докторъ, повелелъ есми Псалтырю тиснути рускыми словами а словенскымъ языкомъ к пожитку посполитого доброго наболей с тое причины, иже мя милостивый богъ съ того языка на светъ пустилъ».

Па колькасці беларускіх рыс выданні Скарыны можна падзяліць на тры групы. Найбольш беларусізмаў у прад-

мовах і пасляслоўях да пражскіх выданняў, бо яны былі напісаны самім Скарынай, самастойна, і аўтар таму быў зусім свабодны ў выбары слоў і форм. Крыху менш беларускіх элементаў у пражскіх біблейскіх тэкстах, таму што тут Скарына быў толькі перакладчыкам, а не аўтарам тэкстаў. Найменшая ж колькасць беларускіх рыс у віленскіх выданнях — «Апостале» і «Малой падарожнай кніжыцы», таму што Скарына меў царкоўнаславянскія тэксты гэтых кніг.

Такім чынам, мова Скарыны ўяўляе сабой вынік уплыву на царкоўнаславянскую мову мовы беларускай народнасці. Для ўсведамлення таго, што мае агульнага мова Скарыны з беларускай мовай старажытнага перыяду і чым ад яе адрозніваецца, трэба азнаёміцца з важнейшымі асаблівасцямі старажытнай беларускай мовы.

У эпоху Адраджэння ў Вялікім княстве Літоўскім выкарыстоўвалася некалькі моў. Паколькі літоўцы складалі нязначную частку насельніцтва княства і не мелі сваёй пісьменнасці, то дзяржаўнай мовай у княстве становіцца беларуская мова. На ёй пісаліся канцылярскія і судовыя дакументы, зводы законаў, напрыклад Вісліцкі статут 1423—1438 гг., Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг., Кніга Віцебскага земскага суда 1533—1540 гг., Кніга Альбрэхта Радзівіла 1646—1648 гг., Кніга Віленскага замкавага суда 1552 г., Кніга канцлера Льва Сапегі 1596—1598 гг.

Перакладаюцца на беларускую мову рэлігійныя аповесці «Пакуты Хрыста», «Аповесць аб трох каралях валхвах», «Жыціе Аляксея, чалавека божага», а таксама аповесці свецкага характару «Александрыя» — аб подзвігах праслаўленага палкаводца старажытнасці Аляксандра Македонскага, «Траянская гісторыя» — аб заснаванні, асадзе і разбурэнні старажытнагрэчаскага горада Троі. На беларускай мове ствараюцца арыгінальныя творы, летапісы, хронікі, гістарычныя запіскі.

Старажытная беларуская мова значна адрознівалася ад

той, якой мы карыстаемся зараз. Яна была больш ускладненай.

Але гэта была ўжо не тая мова, на якой напісаны такія вядомыя творы эпохі Кіеўскай Русі, як «Слова аб палку Ігаравым», «Руская праўда», «Маленне» Данііла Заточніка. Беларуская мова ў часы Скарыны перажывае стадыю свайго станаўлення. Яна яшчэ захоўвае шмат устарэлых старажытнарускіх рыс, але адначасова ў яе пранікае ўсё больш рыс народнай гутарковай мовы. Так, у пісьмовых помніках таго часу ўсё часцей адлюстроўваюцца такія фанетычныя рысы жывой беларускай мовы, як пераход *о, э, е* ў *а, я* ў першым складзе перад націскам, або інакш аканне і яканне (*потаптал, стаяти, с табою, магли, патом, стаить при вяликой дарозе, карою древа*), пераход *е* ў *о* пасля зацвярдзелых зычных перад цвёрдымі (*жона, чоловекъ*), пераход *д, т* у *дз, ц*, або інакш дзеканне і цеканне (*оцецъ, сець, у роце, выцесал, ціотку*), пераход *л* у *ў*, якое з-за адсутнасці літары *ў* перадавалася праз *в* (*забивъ, побивъ, косивъ, заевъ, лизавъ, нашовъ*), прыстаўныя зычныя *в* і *г* (*вужъ, Ганна*), пераход *в* у *ў* (*у Витебску, узяти*), зацвярдзенне шыпячых, *ц* і *р* і губных (*сентебра, Гаврыло, крывда, грошы, жыто, гречыха, на улицы, в концы, цыбули, голубъ, морковъ, кровъ, семъ*).

З сярэдзіны XVI ст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага побач з беларускай пачынаюць ужывацца лацінская і польская мовы, якія, асабліва польская, паступова выцясняюць беларускую мову з ужытку. Перад наступленнем польска-каталіцкай рэакцыі пануючыя класы Беларусі ў імя захавання сваёй улады схіляліся да польскай культуры і мовы, адначасова адракаючыся ад сваёй роднай мовы. Заняпад беларускай мовы паскорыўся пасля дзяржаўнага аб'яднання Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, або так званай Люблінскай уніі, якая была заключана ў 1596 г. Нарэшце спецыяльнай пастановай сейма 1697 г. было забаронена ўжыванне беларускай мовы ў якасці мовы дзелавой пісьменнасці.

З мэтай больш нагляднага азнаямлення з мовай перакладаў Францыска Скарыны разгледзім канкрэтныя яе асаблівасці.

УЖЫВАННЕ КІРЫЛІЧНЫХ ЛІТАР

Славянская азбука (кірыліца), якой карыстаўся Скарына, была выпрацавана на аснове грэчаскай, таму ў ёй, як і ў грэчаскай, для абазначэння асобных гукаў ужывалася дзве, тры літары, якія адрозніваліся толькі месцам напісання ў слове. Яна мела наступны выгляд:

а — а	и }	у }	ѣ
б — б	і } — і	оу } — у	э — э
в — в	к — к	ȣ }	ю — ю
г — г	л — л	ф — ф	Ѫ — у
д — д	м — м	х — х	Ѭ — ю
е }	н — н	ц — ц	ѧ }
є } — е	о } — о	ч — ч	Ѩ } — я
Ѥ }	ω }	ш — ш	ꙗ }
ж — ж	п — п	щ — щ	ѯ — кс
з } — з	р — р	ъ	ѱ — пс
ѕ }	с — с	ю — ы	ѳ — ф
	т — т	ь — ь	ѵ — і

Ужо ў стараславянскай азбуцы было шэсць літар, якія былі лішнімі пры перадачы вымаўлення, але ўжываліся па традыцыі, а таксама для абазначэння лікаў да ўвядзення арабскіх лічбаў. Гэта літары ω (амега), Ѳ (фіта), ѯ (ксі), Ѱ (псі), два з трох *і* (і дзесяцярычнае), ѵ (іжыца).

Скарына, як і пісцы беларускіх помнікаў таго часу, ужо не ўжывае гэтыя літары, акрамя літар Ѫ (юс вялікі), *ѕ* (зело), Ѥ (е ётаванае), Ѭ (юс малы ётаваны).

Літара *ѣ* (яць) ужывалася для абазначэння складанага галоснага гука, які вымаўляўся прыблізна як злітна вы-

маўленае злучэнне *іе͡*. Але ўжо ў старажытнарускай мове гэты гук супаў з *е*. Таму літары *ѣ* і *е* змешваліся ўжо ў старажытнарускіх пісьмовых помніках.

У старабеларускіх тэкстах, паколькі літара *ѣ* перастала абазначаць нейкі асобны гук, яна стала выцясняцца літарай *е*. У Скарыны, з аднаго боку, часта бачым правільнае ўжыванне літары *ѣ* (*заповѣдь, лѣто, хлѣбъ*). З другога боку, на месцы *ѣ* часта выступае *е*, як і ў старабеларускіх тэкстах (*заповедь, лето, хлебъ*).

З дзвюх літар (*и* і *і*) літара *і* ў Скарыны, як і ў старабеларускіх тэкстах, ужываецца даволі рэдка, толькі ў пачатку ўласных назваў (*Ісусъ, Іосифъ, Іорданъ*). Часцей за ўсё Скарына ўжывае літару *и*, характэрную і для старабеларускага пісьма (*изъ египта, иже изъ людей*). Скарына ўпершыню ўжывае літару *й* (*мирный, поживай, твой, дней*).

Па правілах царкоўнаславянскай мовы ў канцы слова пасля цвёрдых зычных заўсёды павінна пісацца літара ъ (ёр). Але ў Скарыны яна тут часта прапускаецца (*потом, послал, помстил*). Гэта ж назіраецца і ў старабеларускіх тэкстах. Як і пісцы старабеларускіх тэкстаў, Скарына часта прапускае пасля мяккіх зычных літару *ь* (ер) (*возму, пришелце, тмы, тмою, силныи, молба*).

Скарына ўжывае злучэнне літар *кг* для абазначэння *г* выбухнога, якое ў многіх іншых мовах перадаецца літарай *g* (*кгора, жыкгимонта, фикги*). Гэта злучэнне было вынайдзена пісцамі старабеларускіх помнікаў для абазначэння выбухнога *г* у запазычаных словах, бо ў словах беларускіх *г* было фрыкатыўным (параўн. нямецкае *h*). Выбухное *г* захоўваецца ў сучаснай беларускай мове ў некалькіх словах (*мазгі, розгі, гузік, гонта, ганак*).

Скарына, імкнучыся зрабіць свае кнігі лёгка чытаемымі для суайчыннікаў, друкаваў іх не царкоўнаславянскай поўнай кірыліцай, а спрошчаным старабеларускім алфавітам.

ПРАВАПІС ЗЫЧНЫХ І ГАЛОСНЫХ ГУКАЎ[1]

У царкоўнаславянскай мове гукі *о* і *е* ў першым складзе перад націскам захоўваліся нязменна. Гэтага правіла прытрымліваецца і Скарына (*внегда, оукрепи, олофернову, мешець, к нему, вознести, дойти, доколе*). Але зрэдку ў Скарыны назіраецца характэрны для беларускай мовы пераход гэтых гукаў у першым складзе перад націскам у *а, я: золатарев* (замест золотарев), *выстерагатися* (замест выстерегатися), *манисто* (замест монисто), *укаряемъ* (замест укоряемъ), *даконаеть* (замест доконаеть), *иржавяетъ* (замест иржавеетъ).

Для беларускай мовы здаўна характэрны прыстаўныя галосныя, якія ўжываюцца, калі слова пачынаецца са збегу зычных. Прыстаўны галосны *и* часам сустракаецца і ў Скарыны, што было адступленнем ад царкоўнаславянскай мовы (*иржавяетъ, илжетъ, игде, ирдящийся, ильстя, ильсти, исперва, ильва, ильснущаяся, илняныхъ, ирците, ирци, ильстецъ, иржати, ильвица, илживыхъ*).

У царкоўнаславянскай мове зычны *в* перад зычнымі захоўваўся нязменна. Захоўвае яго ў гэтых выпадках часцей за ўсё і Скарына: *влити, вместе, вместити, вместо, внести, внешнии, внутръ, внутри.* Але пад уплывам беларускай мовы ў Скарыны часта адзначаецца пераход *в* перад зычнымі ў *у: ꙋсходъ, оу реце, ꙋ долине, ꙋ воде, по ꙋзгоркохъ, у вореху, учинилъ, увечеръ, ускормленъ, увошли, у великом месте.*

Іншы раз у Скарыны *в* ужываецца на месцы *у: вмерети, вмирати, вмучени, вмывалница, вмыти, впадати.* Гэтыя напісанні варта разглядаць як адлюстраванне характэрнага для беларускай мовы *ў*, для абазначэння якога ў старабеларускай мове асобнай літары яшчэ не было.

---

[1] У гэтым раздзеле для лёгкасці азнаямлення з асаблівасцямі фанетыкі, марфалогіі, сінтаксісу і лексікі выданняў Скарыны прыклады падаюцца сучасным алфавітам.

У адрозненне ад царкоўнаславянскай мовы ў Скарыны сустракаюцца прыстаўныя зычныя перад пачатковымі галоснымі: *вужъ, вужева, гужи, гужами, вось, гусеница*. Прыстаўныя *в* і *г* уласцівы, як вядома, беларускай мове. Параўнаем сучаснае беларускае *вуж, гужы, гужамі, вось*.

Губныя зычныя гукі *б, в, м, п, ф* у царкоўнаславянскай мове былі цвёрдымі і мяккімі. Скарына часцей за ўсё захоўвае першапачатковую мяккасць гэтых зычных: *брови, голубя, кровь*. Але побач з гэтым у яго сустракаюцца беларускія цвёрдыя губныя на месцы царкоўнаславянскіх мяккіх: *голубъ, голуба, кровъ, Юдифъ, церковъ, есмъ, осмъ, осмдесять*.

У царкоўнаславянскай мове зычныя *г, к, х* былі толькі цвёрдымі. Напісанні з *ы* пасля гэтых зычных сустракаюцца і ў Скарыны: *сопогы, гынути, погреческыи, ветхыи, убогыми*. Але часта можна сустрэць і ўласцівыя жывому вымаўленню тагачасных беларусаў мяккія злучэнні *ги, ки, хи*: *порускии, жердки, кивати, кидати, кий, кинути, кипарисъ, кипети, кислыи, китъ, гинути, гиблый*.

Шыпячыя гукі *ж, ч, ш, щ* у царкоўнаславянскай мове былі мяккімі, Скарына часцей за ўсё захоўвае гэту мяккасць: *вижь, одежи, воюющие, знающие, ищущие, слухающие, желающие, делающие, живити, живность, живот, животина, животный, живыи, жила, жилище, житейский, житель, жити, житие, житница, житныи, жито*. Але дзе-нідзе можна сустрэць характэрныя для беларускай мовы напісанні *ы* пасля шыпячых: *жывый, жыла*.

Зычны *ц* у царкоўнаславянскай мове быў мяккім. Скарына часцей за ўсё захоўвае яго мяккасць: *жрець, птиць, домочадець, конець, отци, девици, пугвиць, венець*. Але зрэдку можна сустрэць і ўласцівае беларускай мове цвёрдае *ц*: *отец, конец*.

Для царкоўнаславянскай мовы характэрны былі злучэнні *жд, шт* (апошняе перадавалася літарай *щ*). Скарына часта захоўвае гэтыя гукі: *враждующие, чуждии, засмущение*. Але сустракаюцца ў яго і адпаведныя беларускія гукі *ж, ч*:

вижь, ежь, одежи, стеречи, намолвяючи, паметаючи, помочи, по нароженин, выхожаше, гражане.

Пад уплывам беларускай мовы ў Скарыны назіраецца выпадзенне гукаў *д, т* у злучэннях *здн, стн*: *серца, в серци, о празницехъ, на празники, позныи, щасливъ.* Параўнаем царкоўнаславянскія *сердца, о празднецехъ, на праздникы, поздний, щастливъ.*

Царкоўнаславянскім злучэнням *ръ, лъ, рь, ль* (напрыклад, у словах *врьхъ, гръдіи, дръжава, жрьтва, прьвенець, (пръсть, трьпѣние)* у выданнях беларускага першадрукара адпавядаюць усходнеславянскія *ор, ол, ер, ел,* напрыклад: *верхъ, гордый, держава, жертва, первенець, персть, терпение, умертвити.*

Гук *ь* у старажытных злучэннях *рь, ль* у беларускай мове ў адрозненне ад рускай праясніўся ў *ы.* У Скарыны замест царкоўнаславянскіх *дрожащее, задрожало* маем беларускія формы *дрыжащие, задрыжало.* Параўнаем сучасныя беларускія формы *дрыжачыя, задрыжала.*

Азнаямленне з правапісам скарынінскіх выданняў паказвае, што, прытрымліваючыся пераважна царкоўнаславянскага правапісу, выдавец разам з тым дапускаў адхіленні ў бок беларускай мовы, робячы тым самым свае выданні больш зразумелымі для чытачоў-беларусаў.

СКЛАНЕННЕ НАЗОЎНІКАЎ

У царкоўнаславянскай мове было шэсць тыпаў скланення назоўнікаў у залежнасці ад гукаў, на якія заканчваліся іх асновы ў глыбокай старажытнасці, у праіндаеўрапейскай мове, з якой пазней утварыліся многія еўрапейскія і азіяцкія мовы: раманскія, германскія, славянскія, іранскія, індыйскія і інш. Гэтыя канцавыя гукі асноў захаваліся да нашага часу ў некаторых індаеўрапейскіх мовах — літоўскай, лацінскай, грэчаскай. У прыведзеных ніжэй прыкладах з гэтых моў канцавыя гукі асноў падкрэслены.

П е р ш ы т ы п. Асновы на *о* — назоўнікі мужчынскага і

ніякага роду, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, напрыклад: *конь, край, село, поле.* Параўнаем лацінскае doros —'дар'.

Другі тып. Асновы на *ў* (кароткае) — некалькі назоўнікаў (пераважна неадушаўлёных) аднаскладовых, мужчынскага роду: *домъ, медъ, верхъ, низъ, долъ, чинъ, кратъ* ('раз'), *полъ, сынъ, волъ.* Параўнаем лацінскае sunus —'сын'.

Трэці тып. Асновы на *а* — назоўнікі мужчынскага і жаночага роду на *а*: *судья, земля, вода, рука, староста, жена, ладья* (лодка). Параўнаем літоўскае nagá —'нага'.

Чацвёрты тып. Назоўнікі з асновай на *ĭ* — словы мужчынскага і жаночага роду з мяккай асновай: *поуть, ночь, тень, голубь.* Параўнаем літоўскае naktis — 'ночь', лацінскае hostis —'чужынец'.

Пяты тып. Асновы на *у* (доўгае) — назоўнікі *свекры, кры* (сучаснае свякроў, кроў). Параўнаем літоўскае kraujas —'кроў'.

Шосты тып. Асновы на зычныя — назоўнікі *камы* (камень), *имя, мати, небо, племя, семя, темя, пламя, бремя* і г. д. Параўнаем лацінскае nomen — 'імя'.

У далейшым пачалося пераўтварэнне сістэмы скланення па асновах у сучасную сістэму скланення па родах. У адно скланенне аб'ядналіся назоўнікі першых двух тыпаў, а таксама назоўнікі асноў на *і*. Асобнае скланенне ўтварылі назоўнікі асноў на *а*. Асаблівасцю скланення назоўнікаў асноў на *у* (доўгае) і на зычныя было тое, што ў іх ва ўскосных склонах узнікалі ўстаўкі. Напрыклад, у родным склоне: *-ес- (небесе, словесе), -ер- (матере), -ен- (имене), -ят- (теляте), -ъв- (кръве, свекръве).* Гэтыя назоўнікі аб'ядналіся са словамі асноў на *і* і ўтварылі з імі сучаснае трэцяе скланенне. У мове выданняў Скарыны назіраецца разбурэнне старажытнай сістэмы скланення па асновах і ператварэнне яе ў сістэму скланення па родах, як было ўжо ў той час у беларускай мове.

З канчаткам *-у (-ю)* у родным склоне адзіночнага ліку

ў царкоўнаславянскай мове выступалі толькі ўказаныя вышэй некалькі назоўнікаў асноў на *у*. У Скарыны ж з гэтым канчаткам выступаюць таксама і назоўнікі мужчынскага роду асноў на *о*, напрыклад: *гласу Господня, от западу, от выходу, до Египту, от востоку, отъ боку, со единое страны храму, противу западу, со лну, во главу углу, звук грому, день смутку, до Дамаску.*

Канчатак давальнага склону адзіночнага ліку *-ови (-еви)* у царкоўнаславянскай мове быў характэрны толькі для назоўнікаў асноў на *ў* (кароткае). У старабеларускай жа мове з гэтым канчаткам ужываліся і назоўнікі асноў на *о*. Такое ўжыванне канчатка бачым і ў Скарыны: *дневи, лекареви, львови, мужеви, богови, чолневи.*

Назоўнікі асноў на *о* і на *ў* (кароткае) у Скарыны часта выступаюць з канчаткам *-у (-ю)*: *на боку, на чоловеку, на початку.* Так ужываўся ўказаны канчатак і ў старабеларускай мове. У царкоўнаславянскай жа мове канчатак *-у (-ю)* быў характэрны толькі для назоўнікаў асноў на *ў (кароткае).*

У назоўным склоне множнага ліку назоўнікі асноў на *о* і на *ў* (кароткае) у выданнях Скарыны часта ўжываюцца з канчаткам *-и (-ы)*, які ў царкоўнаславянскай мове быў характэрны толькі для асноў на *о*: *домы, листы, мужи, народи, писари, родители, советы.* Гэтыя ж назоўнікі сустракаюцца і з канчаткам *-ове (-еве)*, у царкоўнаславянскай мове ўласцівым толькі асновам на *ў* (кароткае): *верхове, врангове, волотове, рогове.* Такое ўжыванне разглядаемых канчаткаў бачым і ў старабеларускіх пісьмовых помніках.

Назоўнікі асноў на *о* і на *ў* (кароткае) у родным склоне множнага ліку ў выданнях Скарыны часта ўжываюцца з канчаткам *-овъ (-евъ)*, які ў царкоўнаславянскай мове быў характэрны толькі для асноў на *ў* (кароткае): *боевъ, враговъ, даровъ, нравовъ.* Такія формы характэрны для старабеларускай мовы.

У творным склоне множнага ліку ў выданнях Скарыны назоўнікі асноў на *о* і на *ў* (кароткае) выступаюць у форме,

аднолькавай з назоўным склонам, што ў царкоўнаславянскай мове характэрна было толькі для асноў на *о*: *со ослы своими*. Іншы раз назоўнікі ўказаных асноў можна сустрэць і з канчаткам *-ами (-ями)*, у царкоўнаславянскай мове ўласцівым толькі асновам на *а*: *гонцами, гужами, зубами, послами, словами*.

Характэрнае для старабеларускай мовы ў адрозненне ад царкоўнаславянскай змяшэнне асноў назоўнікаў відаць і на прыкладзе меснага склону адзіночнага ліку. У выданнях Скарыны словы асноў на *о* і на *ŭ* (кароткае) часам адзначаюцца з новым для іх канчаткам *-ахъ (-яхъ)*, які ў царкоўнаславянскай мове характэрны толькі для асноў на *а*: *в бедрахъ, во гонениахъ*. Так было і ў старабеларускай мове.

Такім чынам, Скарына, прытрымліваючыся ў асноўным правіл царкоўнаславянскай мовы, разам з тым ужывае і формы назоўнікаў, уласцівыя беларускай мове. Гэта таксама робіць мову яго кніг больш зразумелай шырокаму чытачу.

АБ КАНЧАТКАХ ПРЫМЕТНІКАЎ

Яркім доказам таго, што мова Скарыны ў аснове сваёй царкоўнаславянская, служыць факт, што пануючымі ў родным склоне адзіночнага ліку з'яўляюцца формы прыметнікаў мужчынскага роду з канчаткам *-аго (-яго)*: *безумнаго, великаго, дивнаго, живаго, мудраго, праведнаго, славнаго, ученаго*. Але вельмі часта ўжываюцца і адпаведныя ўсходне-славянскія формы з канчаткам *-ого (-его)*: *белого, вечного, доброго, чистого*.

Прыметнікі жаночага роду ў родным склоне адзіночнага ліку ў Скарыны часта маюць царкоўнаславянскі канчатак *-ие (-ые)*: *жены, почстивые, пречистыя девици, всея вселенныя, от горы святыя*. Гэтыя ж прыметнікі могуць мець у яго і пашыраныя ў старабеларускай мове формы з канчаткам *-ое (-ее)*: *великое славы, далекое земли, силное обороны, из чужее земли, жертвы мирное, з доброе воли*.

У творным склоне адзіночнага ліку прыметнікі жаночага роду сустракаюцца ў творах Скарыны з канчаткам *-ою (-ею)*, вельмі пашыраным у старабеларускай мове: *тучною шиею, помощию малою.*

У царкоўнаславянскай мове прыметнікі і дзеепрыметнікі мелі ў назоўным склоне множнага ліку для мужчынскага роду канчатак *-ии (-ыи)*, для жаночага — *-ая (-яя)*, для ніякага — *-ие (-ые)*. Часта такое ўжыванне ў Скарыны захоўваецца: *древнии волотове, мудрыи друзи, добрая дела, таковая слова.* У беларускай мове таго часу агульным для трох родаў прыметнікаў у назоўным склоне множнага ліку становіцца канчатак *-ие (-ые)*. Такія формы ёсць і ў Скарыны: *великие тайны, многие книги, воды морские, грады обительные, звери дубравные.*

Такім чынам, і на прыкладзе прыметнікаў мы бачым імкненне Скарыны наблізіць царкоўнаславянскую мову ў сваіх выданнях да беларускай.

АБ УЖЫВАННІ ЗАЙМЕННІКАЎ

У перакладах Скарыны побач з царкоўнаславянскім займеннікам 1-й асобы адзіночнага ліку *азъ* ужываецца і адпаведны ўсходнеславянскі *я*: *азъ сплю, азъ выведохъ, азъ куплю, я Францискъ Скорининъ сынъ.*

У царкоўнаславянскай мове ў давальным і вінавальным склонах ужываліся праклітычныя і энклітычныя займеннікі. Першыя з іх стаялі звычайна перад дзеясловам, да якога адносіліся (давальны склон: *мне, тебе, собе, намъ, вамъ;* вінавальны: *мене, тебе, себе, насъ, васъ*), другія — пасля (давальны склон: *ми, ти, си, ны, вы;* вінавальны склон: *мя, тя, ся, ны, вы*). У Скарыны энклітычныя займеннікі ўжываюцца рэдка, на іх месцы пасля дзеясловаў можна сустрэць праклітычныя, як і ў старабеларускай мове: *повелелъ ми, възбужу на тя злое,* але: *научают насъ, выбежали на насъ.*

У Скарыны пераважаюць уласцівыя беларускай мове формы давальнага і меснага склонаў асабовага і зваротнага займеннікаў: *тобе, собе.* Для царкоўнаславянскай мовы

характэрны былі формы *тебе, себе*, якія захаваліся ў рускай мове.

Такім чынам, у формах, характэрных для беларускай ці наогул для ўсходнеславянскіх моў, сустракаюцца ў выданнях Скарыны і займеннікі.

ФОРМЫ ДЗЕЯСЛОВАЎ

У 2-й асобе адзіночнага і множнага ліку цяперашняга і будучага часу ў выданнях Скарыны пераважаюць царкоўнаславянскія формы на *-ши*: *биеши, видиши, возложиши, жадаеши, живеши, идеши, лежиши, можеши, пытаеши, станеши*. Але часам можна знайсці і формы на *шъ*, уласцівыя беларускай мове: *будешъ, збираешъ, можешъ*.

У выданнях Скарыны дзеясловы ў 3-й асобе адзіночнага і множнага ліку ўжываюцца з мяккім канчаткам — *-ть*, характэрным для старабеларускай мовы: *будеть, даеть, живеть, зрить, любить, пишеть, стоить, хоцеть, видять, прорекуть, будуть*. Для царкоўнаславянскай жа мовы характэрны формы на *-тъ* (*т* цвёрдае).

У 1-й асобе множнага ліку найбольш пашыранымі з'яўляюцца формы на *-мъ*, якія захоўваюцца ў рускай і беларускай мовах і зараз: *будемъ, взыйдемъ, загинемъ, знаемъ, можемъ, скажемъ*.

Сярод форм загаднага ладу 2-й асобы адзіночнага ліку ў Скарыны пераважаюць царкоўнаславянскія з ненаціскным канчаткам *-и*: *буди, востани, избави*. Але можна сустрэць і ўсходнеславянскія формы на мяккі зычны: *верь, видь, дозволь, оставь, позычь, понизь, приедь*.

Найбольш пашыранымі формамі загаднага ладу 2-й асобы множнага ліку з'яўляюцца ўсходнеславянскія без *-и-* ў аснове: *будьте, видьте, кричьте, повесте, слышите, чинте, ненавидьте*.

Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў) у Скарыны мае часцей за ўсё царкоўнаславянскі суфікс *-ти*: *добыти, держати, купити, мучити, жаловати*. Але зрэдку сустрака-

юцца ўласцівыя ўжо ў той час жывой беларускай мове. з суфіксам *-ть: будете приносить жертвы.*

У Скарыны часам сустракаюцца дзеепрыслоўі на *-учи (-ючи)*, уласцівыя тагачаснай беларускай мове: *не могу оубо боячися отвещати, панна шла за нею несучи плащъ ея, он же плакалъ естъ едучи.*

Такім чынам, Скарына, ужываючы часам беларускія і ўсходнеславянскія дзеяслоўныя формы на месцы царкоўнаславянскіх, імкнецца зрабіць мову сваіх кніг больш зразумелай для суайчыннікаў.

З СІНТАКСІСУ

У выданнях Скарыны пераважаюць царкоўнаславянскія сказы, у якіх пры выказніку адмоўе не паўтараецца: *и никто же смеаше спротивится им понеже страхъ ихъ великий нападе на нихъ; и ниедино место знайдеся имъ; никтоже возможетъ супротивитися вамъ; никтоже оуслышит мя.* Але можна знайсці і выпадкі паўтарэння адмоўя *не* пры выказніку, як і ў беларускай мове: *никого Царь чтити не будеть.* Нават гэта адна з'ява сведчыць аб тым, што імкненне наблізіць мову сваіх выданняў да роднай мовы землякоў-беларусаў праяўляецца і ў сінтаксісе кніг Скарыны.

ЛЕКСІКА

Найбольш прыкметнай у выданнях Скарыны з'яўляецца лексіка, характэрная для ўсіх славянскіх моў. Яна называецца агульнаславянскай. Гэтыя словы абазначаюць прыродныя з'явы, назвы зямной паверхні, адрэзкаў часу, дрэў, жывёл, людзей па іх роднасці і сваяцтву, матэрыялаў, некаторых дзеянняў, якасцей і г. д.: *бегъ, беда, битва, бой, братъ, вдова, векъ, вера, верхъ, весна, ветръ, вечеръ, вина, внукъ, вода, воинъ, воля, глина, гневъ, гнездо, годъ, гора, горло, грехъ, дедъ, дело, душа, день, дно, домъ, дубъ, духъ, дымъ.*

Імкнучыся зрабіць мову сваіх выданняў больш зразумелай простаму чытачу, Скарына замест некаторых незразумелых царкоўнаславянскіх слоў ужываў беларускія. Беларускіх слоў у яго выданнях вельмі многа: *баламутъ, ботъ, ботянъ, боханъ, взоръ, волотъ, ворожбитъ, вужъ, вышиня, гай, глубиня, господаръ, гукъ, гулня, гусли, детинство, дубецъ, зброя, згода, клопотъ, конникъ, кривда, криница, кропля, куделя, кутъ, оксамитъ, олей, поклепъ, поло́нъ, помста, початокъ, праца, пригода, прикладъ, подлога, промень.*

Некаторыя словы прыдуманы самім Скарынай, вось асобныя з іх: *глуповство, действо, дуровство, ленивство, подобенство, скуповство* і інш.

Але самай вялікай групай слоў у выданнях Скарыны з'яўляюцца словы царкоўнаславянскія. Гэта сведчыць яшчэ раз аб тым, што мова яго выданняў царкоўнаславянская. Вось некаторыя характэрныя царкоўнаславянскія назоўнікі: *адъ, бдение, бездна, безумие, благодарение, благославение, брань* (бітва), *брашно* (харч), *вервь* (вяроўка), *возрастъ, вопль, вретище* (рыззё), *глаголъ, господинъ, десница* (правая рука), *дщера* (дачка), *естество* (істота), *жезлъ, зерцало* (люстэрка), *источникъ, клевета, ковчегъ* (марское судна), *лесть, месть, мзда, мститель, наследникъ, недугъ* (хвароба), *нищета, обетъ* (клятва, абяцанне), *обилие, овенъ* (баран).

Прыведзеныя словы надаюць мове ўрачысты характар, некаторыя з іх звычайныя і ўжываюцца ў сучаснай рускай мове, асабліва ў паэзіі. Большасць з іх не патрабуюць перакладу.

Яркім доказам царкоўнаславянскай моўнай асновы выданняў Скарыны з'яўляецца перавага характэрнай для царкоўнаславянскай мовы няпоўнагалоснай лексікі над усходнеславянскай і беларускай поўнагалоснай. Вось некаторыя са шматлікіх у Скарыны царкоўнаславянскіх няпоўнагалосных слоў: *брегъ* (бераг), *врагъ, владети, власть* (волость), *врата, вредъ, время, глава, гладъ* (голад), *гласъ* (голас), *градъ* (горад), *длань* (далонь), *длато* (долата),

драгий (дарагі), *древо, здравие, злато, кладезь* (калодзеж), *класъ* (колас), *краткий, младый, млатъ* (молат).

Побач з гэтымі ён іншы раз ужывае і ўсходнеславянскія поўнагалосныя словы: *борона, боронити, голодный, голодъ, долото, дорога, короткость, молодець, молотити, молотъ, оборона, полóнъ, порогъ, похоронити, середний, соромъ, сторожа, сторожъ.*

Яркай прыкметай царкоўнаславянскіх слоў у Скарыны з'яўляюцца злучэнні *жд, щ: вражда, жажда, нужда, прежде, чуждый, нощный, нощъ, обещати, овощъ,* прыстаўка *пре-: превеликий, превышний, предивный, презлый,* прыстаўка *воз- (вос-): возвеличити, возвратити* і інш.

Скарына разумеў, што многія царкоўнаславянскія словы цяжкія для разумення простаму чытачу. Таму ён даваў пераклад іх на палях. Такі прыём тлумачэння слоў называецца глосай. Сам Скарына пісаў пра гэта так: «Такъ же положилъ есми на боцехъ некоторыи слова для людей простыхъ, не рушаючи самое Псалтыри ни въ чемъ же, яко суть Онагри и Геродеево жилище и хлябие, и иные слова, которыи суть въ Псалтыри нерозумныи (г. зн. незразумелыя) простым людемъ, найдуть ее на боцехъ руским языком что которое слово знаменуеть». Глосы — адна з самых цікавых і выдатных асаблівасцей выданняў Скарыны. У іх праяўляецца яшчэ адна здольнасць Скарыны — вучонага-моваведа. Звычайна Скарына ўжывае глосы пры тлумачэнні незразумелых назваў жывёл, раслін, прадметаў быту, геаграфічных назваў, напрыклад: онагри — *лоси, пажить* — *былие, тимъпанъ* — *бубенъ, холми* — *узгорки, ефиоплене* — *муринове* (муринъ — негр).

Менавіта глосы аказалі вялікую дапамогу ў стварэнні капітальных па тым часе царкоўнаславянска-беларускіх слоўнікаў яго паслядоўнікам — Лаўрэнцію Зізанію — «Лексіса» (1596, Вільня) і Памве Бярындзе — «Лексікона» (1627, Кіеў, 1653, Куцеін) і інш.

Як вядома, для ажыццяўлення выдання Бібліі на царкоўнаславянскай мове Скарына карыстаўся чэшскай Біблі-

яй 1506 г. Пры перакладзе ў мову Скарыны трапілі шматлікія чэшскія словы. Чэшскія лексічныя запазычанні — спецыфічная асаблівасць выданняў Скарыны. Для прыкладу можна ўзяць такія: *змизати* 'знікнуць' — *ангел божии змизалъ отъ очию его, занепразнити* 'заняць'— *занепразнилъ коханиемъ серце его, либивость* 'прыгажосць' — *кравы при той же либивости зостали, рукавникъ* 'сетка птушкалова' — *куропатва вгонена бывает в рукавникъ.*

Адрозненні мовы Скарыны ад царкоўнаславянскай мовы асабліва выразна бачны, калі параўнаем урывак з яго выдання з адпаведным тэкстам з выдадзенай на царкоўнаславянскай мове Бібліі Іванам Фёдаравым у горадзе Астрогу на Украіне ў 1581 г:

Астрожская Біблія	Біблія Скарыны
И рече воозъ къ рȣѳи, слыши дщи не ходи събирати на инȣ, и не ωтходиши ωтсюдȣ, но здѣ пристани къ отроковицамъ моимъ. И очи твои да бȣдета на нивѣ идѣже жнȣть, и да ходиши въслѣд ихъ, и се заповѣдаю отроком моимъ не присѧщи к тебѣ. и егда въжадаеши да идеши къ сосȣдомъ и піеши ωтнȣдȣ же черплют жатели...	Тогда рече Воозъ к руѳе слыши ты дщеро не ходижъ инде збирати класовъ, и не ωтходи с полѧ сего но буди с девками моими. И игде они жати будуть тȣ сбирай после нихъ. Понеже есми приказал отрокомъ моимъ Абы ни единъ не перешкажалъ тобѣ. Захощеть ли ти сѧ пакъ пити то да идеши к сосудом и напийсѧ воды юже пиють женци мои

Для таго каб пераканацца наглядна ў тым, што мова Скарыны адрозніваецца ад беларускай мовы таго часу сваёй царкоўнаславянскай асновай, параўнаем той жа ўрывак з выдання Скарыны з адпаведным тэкстам са старабеларускага перакладу Бібліі, зробленага ўслед за выданнем Скарыны ў XVI ст. Для разумення зместу ўрыўка прыводзім яго пераклад на сучасную беларускую мову:

И реклъ боазъ рȣте чи не слышишь дочко не ходи збирати въ поле иное ани переступаи ѡ^{т}сюль и тȣть прилеписѧ з дѣвками моими: ѡчи твои в поли и^{ж} жнȣть и пойдешь за ними ведь же вказалъ есми молоденьцомъ абы сѧ не дотыкати тебе и пожадаешь и пойдешь къ сȣдѡмъ и бȣдешь пити ѡ^{т}ȣль иже пьють молодици.

І кажа Ваоз да Руфы, паслухай, дачка, не ідзі збіраць у іншае месца і не адыходзь адсюль, але тут далучыся да дзяўчат маіх. І дзе яны жаць будуць, там збірай пасля іх. Бо я загадаў хлопцам маім, каб ніводзін не перашкаджаў табе. А калі табе захочацца піць, ідзі да посуду і напіся вады, якую п'юць жнеі мае.

Параўнанне прыведзеных урыўкаў паказвае, што пераклад Скарыны па моўных асаблівасцях стаіць бліжэй да старабеларускага перакладу, чым царкоўнаславянскі тэкст. У гэтым і заключаецца ажыццяўленне мэты, якую ставіў перад сабой Скарына як перакладчык, кнігавыдавец і асветнік свайго народа.

ЗАКЛЮЧЭННЕ



падчыну Скарыны ў гісторыі беларускай і ўсходнеславянскай культуры зараз цяжка пераацаніць. Кіруючыся сваімі рэфарматарскімі і асветніцкімі мэтамі, ён смела ўводзіў у царкоўнаславянскі тэкст выданняў беларускія словы і выразы. Ён першы арганізаваў кнігадрукаванне для свайго народа, даў друкаваную кнігу, адваяваўшы яе з-пад улады царквы.

На тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны на працягу XVI—XVII стст. адкрываюцца шматлікія друкарні — у Брэсце, Вільні, Заблудаве, Лоску, Любчы, Мінску, Магілёве, Слуцку, Супраслі, Астрогу і інш. Кнігі выдаюцца на беларускай, украінскай, літоўскай, царкоўнаславянскай, польскай, лацінскай мовах. Першая друкарня пасля скарынінскай — Брэсцкая была заснавана ў 1553 г. У Брэсцкай друкарні ў 1563 г. была надрукавана на польскай мове пратэстанцкая Біблія. У 1562 г. была адкрыта друкарня ў Нясвіжы, у якой у гэтым жа годзе беларускія друкары і асветнікі Сымон Будны, Мацей Кавячынскі і Лаўрэнцій Крышкоўскі выдалі дзве

кніжкі — «Катэхізіс» і «Апраўданне грэшнага чалавека перад богам». Узорам для нясвіжскіх друкароў паслужылі шрыфты Скарыны. У прадмове да «Катэхізіса» змяшчаецца заклік у духу скарынінскіх запаветаў да князёў Радзівілаў, каб яны «не тольки в чужеземских языках кохали, але бы ся теж... и того здавна славнаго языка словенского размиловати и оным ся бавити рачили». Сымон Будны наблізіў мову царкоўных тэкстаў да жывой беларускай мовы. Яго «Катэхізіс» выдадзены на беларускай мове.

У Заблудаве ў маёнтку князя Рыгора Хадкевіча арганізавалі друкарню рускія першадрукары Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец. Тут у 1569 г. было надрукавана «Учительное евангелие». Пазней, у 1574 г., Пётр Мсціславец адкрыў друкарню ў Вільні, у якой сярод іншых кніг надрукаваны і III Статут Вялікага княства Літоўскага.

Васіль Цяпінскі арганізаваў у Нясвіжы (1580) маленькую друкарню і выдаў Евангелле. Гэта выданне вылучаецца тым, што зроблена яно паралельна на дзвюх мовах — царкоўнаславянскай і беларускай. Выданне Цяпінскага мела вялікае значэнне для павышэння аўтарытэту беларускай мовы ў старажытны перыяд, бо паказала раўнацэннасць яе з царкоўнаславянскай мовай.

У канцы XVI—XVII ст. пачало ўзнікаць і шмат іншых перакладаў царкоўных кніг на беларускую мову. З друкаваных рэлігійных кніг на беларускай мове, выдадзеных у гэты перыяд, можна назваць «Казанне Кірыла» (Вільня, 1596), «Два казанні» Л. Карповіча (Еўе, 1616), «Евангелле вучыцельнае» (Еўе, 1616), «Кінавіён» (Еўе, 1618), «Навука аб сямі тайнах» (Вільня, 1620), «Казанне пахавальнае» М. Сматрыцкага (Вільня, 1620) і інш. Працягвалі з'яўляцца і рукапісныя пераклады свяшчэнных кніг на беларускую мову, напрыклад рукапісная Біблія пачатку XVII ст.

Справа, пачатая Скарынай, была працягнута яго паслядоўнікамі. Ужыванне пісьмовай беларускай мовы набыло небывалы размах.

ЛІТАРАТУРА ПРА СКАРЫНУ

Багдановіч М. Збор твораў: У 2-х т.— Мн., 1968, т. 1.— 552 с.

Беларуская савецкая энцыклапедыя: У 12-ці т.— Мн., 1973, т. 9, 640 с.

Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве.— М., 1979.—279 с.

Геніюш Л. Невадам з Нёмана.— Мн., 1967.—207 с.

Караткевіч У. Мая Іліяда.— Мн., 1969.—191 с.

Климкович М. Н. Георгий Скорина.— Л., 1958.—392 с.

Лойка А. Каб не плакалі кані.— Мн., 1967.—127 с.

Майхровіч С. Георгій Скарына.— Мн., 1966.—187 с.

Немировский Е. Л. Начало книгопечатания в Белоруссии и Литве.— М., 1978.—160 с.

Немировский Е. Л. Начало славянского книгопечатания.— М., 1971.—269 с.

Песнь о книге.— Мн., 1977.—351 с.

Подокшин С. А. Франциск Скорина.— М., 1981.—215 с.

Подокшин С. А. Скорина и Будный.—Мн., 1974.—175 с.

Прашковіч М. Францішак Скарына — беларускі першадрукар.— Мн., 1970.—95 с.

Садкович Н. И., Львов Е. Л. Георгий Скорина.— Мн., 1966.—462 с.

Слоўнік мовы Скарыны: У 2-х т.— Мн., 1977, т. 1.—476 с.

Царанкоў Л. А. Францыск Скарына і яго час.— Мн., 1975.—64 с.

400 лет русского книгопечатания: У 2-х т.— М., 1964, т. 1. Русское книгопечатание до 1917 года.— 662 с.

450 год беларускага кнігадрукавання.— Мн., 1968.—434 с.

Ялугин Э. В. Мстиславцев посох.— Мн., 1978.—272 с.

ЗМЕСТ

Уводзіны 3
Изъ славнаго града Полоцька... 5
В ле́карстве и в науках вызволёных доктор... 9
Выложены доктором Франциском Скориною с Полоцька... . . . 11
Рускыми словами а словенскымъ языкомъ... 26
Заключэнне 45
Літаратура пра Скарыну 47

Сокровища языка

Владимир Митрофанович Свежинский

СЛОВО СКОРИНЫ

Для старшего школьного возраста
Минск, издательство «Народная асвета»

На белорусском языке

Рэдактары *М. Я. Шчарбун, Р. Ф. Кузняцова.* Афармленне *Э. Э. Жакевіча, В. П. Масцерава.* У афармленні выкарыстаны гравюры *Ф. Скарыны.* Мастацкі рэдактар *Н. Л. Шаўшукова.* Тэхнічны рэдактар *С. І. Ліцкевіч.* Карэктары *М. Г. Вінаградава, Р. С. Ахрэмчык.*

ІБ № 1699

Здадзена ў набор 06.06.83. Падпісана ў друк 23.12.83. АТ 21237. Фармат $70\times108^{1}/_{32}$. Пап. друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Умоўн. друк. арк. 2,1. Умоўн. фарба-адбіт. 4,55. Ул.-выд. арк. 2,2. Тыраж 13 000 экз. Заказ 3751. Цана 15 к.

Выдавецтва «Народная асвета» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600 Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005 Мінск, Чырвоная, 23.



РАДОСТЬ
ВЯЛІКІЯ
ОБЩЕСТВО
ЗЯМЛЯ
станционная
ЦЕНТР
ВАСІЛЁК
ПЕРЕКРЕСТКЕ
Опыт и доверие
МОВА
РАНІЦА
Ковер
СНЕЖАНЬ
ЗВЫЧАИ
ИСКУССТВО
tout un atelier
ЗНАКОМЫЕ
ПРОГРАММА
Когда
МИНСК
chromatography
Ю
ЗВАНЫ
сопутствует
слово
ЗВЕЗДЫ
REPUTATION
МАССОВОЕ
КНИГА
di concepire il televisore
instrumentation
НАРОД
ЛЮДЗІ

15 к.

Што такое мова?
Якія функцыі мовы ў грамадстве?
Калі людзі навучыліся пісаць?
Які гістарычны лёс беларускай мовы
і пісьменнасці?



На гэтыя і многія іншыя пытанні
юны чытач знойдзе адказ
у кнігах серыі «Скарбы мовы».
Кнігі выходзяць
на рускай і беларускай мовах.
Яны дапамогуць зразумець,
у чым сакрэт выразнасці
і багацця мовы,
як авалодаць гэтым важнейшым
здабыткам чалавека.